Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава"
Кафедра гісторыі Беларусі

**М.В. Півавар**

# Гісторыка-краязнаўчая практыка

*Метадычныя рэкамендацыі*

Репозиторий ВГУ

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2015*

УДК 94(476.5)+908(476.5)(075.8)
ББК 63.3(4Беи-4Вит)я73+26.890(4Беи-4Вит)я73
П32

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 2 ад 24.12.2014 г.

Аўтар: дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт **М.В. Півавар**

Р э ц э н з е н т ы :
галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта *Д.В. Юрчак*;
загадчык кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.М. Дулаў*

Репозиторий ВГУ

**Півавар, М.В.**
**П32** Гісторыка-краязнаўчая практыка : метадычныя рэкамендацыі / М.В. Півавар. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 52 с.

Метадычныя рэкамендацыі змяшчаюць мэты, задачы, тэарэтычны і практычны мінімум, неабходныя студэнтам для эфектыўнай арганізацыі сваёй працы падчас гісторыка-краязнаўчай практыкі, а таксама дапаможны матэрыял, прыклады афармлення справаздачнай дакументацыі.

Прызначаны для студэнтаў гістарычнага факультэта спецыяльнасці “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны”, кіраўнікоў і арганізатараў практыкі.

**УДК 94(476.5)+908(476.5)(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи-4Вит)я73+26.890(4Беи-4Вит)я73**

© Півавар М.В., 2015
© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015

## ЗМЕСТ


Уводзіны ………………………………………………...………………………. 4
Мэты і задачы практыкі …………………………………………..……………… 5
Базы практыкі ………………………………………………….………………… 5
Змест і арганізацыя гісторыка-краязнаўчай практыкі ………...……………… 6
*Правы і абавязкі студэнтаў* ………………………………...………………… 7
*Патрабаванні бяспекі да студэнтаў у час правядзення паходу і экскурсіі* ….…… 7
*Абавязкі факультэцкага кіраўніка практыкі* ………...……………………… 9
*Абавязкі групавых кіраўнікоў-метадыстаў* ………………………………. 9
Метадычныя рэкамендацыі па афармленні дакументацыі …………………… 10
Дадаткі ………………………………………………………………………… 12
Прыкладны план правядзення гісторыка-краязнаўчай практыкі ……………... 12
Прыкладная тэматыка індывідуальных заданняў ……………………………… 14
Спіс літаратуры ў дапамогу студэнту ……………………………………... 16
Інструкцыя па тэхніцы бяспекі ……………………………………………… 25
Узоры афармлення дакументацыі ……………………………………..….... 28
*Узоры афармлення тытульных аркушаў* ………………………………….... 28
*Узор афармлення тытульнага аркуша дзённіка гісторыка-краязнаўчай практыкі* ……………………..…………………………………………... 28
*Узор афармлення тытульнага аркуша індывідуальнага задання* ……………… 29
*Узор афармлення і напісання справаздачы па выніках праходжання практыкі* 30
Прыклады вядзення дзённіка ……………………………...………………… 31
Прыклад індывідуальнага задання ………………………………………… 37
Патрабаванні для абгрунтавання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці выяўленаму матэрыяльнаму аб’екту …………………………………….... 42
Прыклады апісання і абгрунтавання статусу гісторыка-культурных каштоўнасцяў выяўленым матэрыяльным аб’ектам …………………………… 43
*Сядзібны дом маёнтка “Мілае” ў в. Мазалава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна* ………………………………………………………………...…… 43
*Адміністрацыйны будынак былой Земляробчай школы ў в. Лужасна Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна* ………………………………………… 46
*Царква Узнясення (Пакроўская) у в. Лужасна Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна* …………………………..……………………………………… 46
Прыклады афармлення апісання і абгрунтавання статусу помнікаў прыроды …….. 46
*Хвоя-гігант каля в. Сушчова Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна* ……….…. 46
*Дуб-волат каля в. Александрова Багушэўскага п/с Сенненскага раёна* ……….. 47
*Вялікія камяні Кавалёўскія каля в. Кавалёва Віцебскага раёна* ………..……… 47
*Камень Кахання каля в. Доўжа Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна* ………… 47
*Святая крыніца каля в. Суднікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна* ………… 48
План апісання музейнай экспазіцыі ……………………………………… 49
Музеі Віцебска, рэкамендаваныя для наведвання падчас праходжання практыкі ……………………………………………………………………… 49


Репозиторий ВГУ

# УВОДЗІНЫ

Гісторыка-краязнаўчая практыка праводзіцца на гістарычным факультэце ад пачатку яго заснавання і з'яўляецца важнай часткай падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў, працягам вучэбнага працэсу ў вытворчых і палявых умовах. На працягу двух тыдняў практыкі студэнты вырашаюць дзве задачы: пашыраюць веды пра г. Віцебск і рэгіён і вучацца прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы.

Гэта добры час. У паходах і паездках яны даведваюцца пра гісторыка-культурныя каштоўнасці, эканамічны, прыродны, рэкрэацыйны патэнцыял Віцебшчыны. Студэнты вучацца рыхтаваць і праводзіць экскурсію па родным горадзе ці вёсцы, распрацоўваць маршруты турысцкіх паходаў і ажыццяўляць іх. Падчас паходаў студэнты спрабуюць выяўляць помнікі гісторыі і культуры, даваць ім характарыстыку (вызначаць стыль, час, асаблівасці), рыхтаваць дакументы па выяўленым помніку для падачы ў адпаведныя дзяржаўныя ўстановы, пісаць артыкул для газеты ці Інтэрнэт-рэсурса.

Гэтыя ўменні і навыкі неабходныя будучаму настаўніку гісторыі. Пры вывучэнні шэрагу вучэбных прадметаў, а таксама ў пазаўрочнай і пазашкольнай працы дзякуючы выкарыстанню краязнаўчага падыходу фарміруецца развітая сацыяльнаспелая асоба. Яно спрыяе: развіццю патрыятычнага пачуцця да Радзімы; абуджэнню цікавасці да пазнання гісторыі краю; развівае ў навучэнцаў назіральнасць, мышленне, імкненне да самастойнага гістарычнага мыслення і творчай працы; садзейнічае зацікаўленню навукай, выхаванню волі і іншых важных якасцяў асобы; павышэнню інтарэсу вучняў (і настаўнікаў) да вывучэння гісторыі "малой радзімы"; выхаванню любові да сваёй зямлі, адчування велічы працы землякоў; актывізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ходзе заняткаў краязнаўствам; устанаўленню больш цесных міжпрадметных сувязяў у працэсе навучання; дапамагае настаўніку актывізаваць навучальны працэс і шэраг іншых якасцяў.

Раней практыка арганізоўвалася па ўсёй краіне. Былі выезды ў Мінск, Гродна, Магілёў. На жаль, у сувязі са складанай эканамічнай сітуацыяй цяпер яна праводзіцца толькі ў межах Віцебшчыны. Аднак наваколлі Віцебска багатыя на помнікі гісторыі і культуры і даюць магчымасць скласці ўяўленне аб разнастайных стылях і накірунках архітэктуры, убачыць помнікі археалогіі, а разуменне, што такое багацце знаходзіцца зусім паблізу ад роднага горада, спрыяе яшчэ большай любові да "малой радзімы", а разам з гэтым умацоўвае павагу да роднай краіны.

Репозиторий ВГУ

## МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ПРАКТЫКІ

Гісторыка-краязнаўчая практыка студэнтаў з'яўляецца важнай часткай навучальнага працэсу, значным элементам у сістэме падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў і накіравана на замацаванне ведаў, атрыманых у працэсе навучання, авалоданне вытворчымі навыкамі. У час практыкі замацоўваюцца і паглыбляюцца веды, атрыманыя на аўдыторных занятках па шэрагу дысцыплін (археалогія, краязнаўства, этнаграфія, гісторыя Беларусі і інш.). Практыка спрыяе фарміраванню патрыятычных пачуццяў і пашырэнню прафесійнага кругагляду.

Гісторыка-краязнаўчая практыка забяспечвае падрыхтоўку студэнтаў да выкарыстання розных методык і крыніц у вучэбнай і пазакласнай працы па гісторыі і краязнаўстве, вядзенні самастойнай навукова-даследчай дзейнасці.

**Мэты гісторыка-краязнаўчай практыкі:** фарміраванне ў будучых спецыялістаў уяўлення пра асноўныя формы краязнаўчай працы, уменняў і навыкаў практычнай дзейнасці ў галіне гістарычнага краязнаўства і спецыяльных гістарычных дысцыплін, азнаямленне студэнтаў з гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, насельніцтвам і прыродай Рэспублікі Беларусь.

**Задачы гісторыка-краязнаўчай практыкі:**

- паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў, набытых у рамках вывучэння курсаў па спецыяльнасці;
- навучанне методыцы правядзення самастойных даследаванняў роднага краю (вывучэння крыніц па гісторыі рэгіёна, помнікаў гісторыі і культуры і іх выкарыстання ў навучальным працэсе, методыцы пастаноўкі іх на ўлік, камеральных і палявых даследаванняў і інш.);
- азнаямленне з важнейшымі помнікамі гісторыі і культуры Рэспублікі Беларусь і Віцебскай вобласці, турыстычнымі рэсурсамі краіны і рэгіёна;
- фарміраванне ўяўленняў аб працы дзяржаўных органаў і ўстаноў у галіне культуры, адукацыі, аховы прыроды, эканомікі;
- развіццё аналітычных навыкаў і крытычнага мыслення;
- выхаванне грамадзянскіх якасцяў і ў першую чаргу пачуцця патрыятызму і паважлівага стаўлення да гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны Беларусі.

## БАЗЫ ПРАКТЫКІ

Базамі практыкі выступаюць гарады і раёны Рэспублікі Беларусь, у першую чаргу Віцебскай вобласці. Вывучэнне рэгіёнаў адбываецца шляхам арганізацыі паходаў, экскурсій, паездак, экспедыцый, а таксама наведвання музеяў, устаноў і арганізацый.

Рэпазіторый ВДУ

## ЗМЕСТ І АРГАНІЗАЦЫЯ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАЙ ПРАКТЫКІ

Гісторыка-краязнаўчая практыка праводзіцца ў форме групавога наведвання студэнтамі вызначаных тэрыторый падчас экскурсій, турысцка-краязнаўчых паходаў. У час экскурсіі і паходу студэнт павінен фіксаваць асноўную інфармацыю.

Гісторыка-краязнаўчая практыка праводзіцца на аснове загадзя складзенага графіку, які адпавядае праграме практыкі і падрыхтаваны згодна з графікам вучэбнага працэсу. Правядзенне заняткаў плануецца па днях на ўвесь тэрмін практыкі. Графік праходжання практыкі штогод разглядаецца на пасяджэннях кафедры і зацвярджаецца дэканам факультэта. Да пачатку практыкі зацверджаны графік даводзіцца да студэнтаў, яго копіі перадаюцца старастам груп.

Правядзенне практыкі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з загадам рэктара ВДУ імя П.М. Машэрава “Аб правядзенні вучэбнай гісторыка-краязнаўчай практыкі студэнтаў 1 курса дзённай формы навучання гістарычнага факультэта” з указаннем прозвішчаў студэнтаў, канкрэтных месцаў, тэрмінаў праходжання практыкі, групавых кіраўнікоў, адказных і кантралюючых асоб. Праект загада рыхтуецца дэканатам (факультэцкім кіраўніком практыкі) і падаецца кіраўніку практык універсітэта не пазней, чым за два тыдні да пачатку практыкі.

Гісторыка-краязнаўчая практыка праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам на першым курсе ў другім семестры. Яе тэрмін складае два тыдні, звычайна ў ліпені. Агульная арганізацыя і кіраўніцтва практыкай здзяйсняюцца факультэцкім кіраўніком практыкі, прызначаным загадам рэктара ўніверсітэта з ліку найбольш дасведчаных і вопытных выкладчыкаў.

Кіраўнік практык універсітэта і адпаведныя падраздзяленні (агульны аддзел, упраўленне бухгалтарскага ўліку і фінансаў, адміністрацыйна-гаспадарчая частка) забяспечваюць своечасовае афармленне вызначанай дакументацыі і фінансаванне.

Выкладчыкам і студэнтам, якія выязджаюць на вучэбную практыку, аплата праезду, сутачных і кватэрных выдаткаў, а таксама за наведванне музеяў ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым дзеючымі нарматыўна-прававымі дакументамі.

Вучэбна-метадычнае кіраўніцтва практыкай і выкананне вучэбных планаў забяспечвае кафедра гісторыі Беларусі.

Адказнасць за арганізацыю і правядзенне практыкі, а таксама кантроль за яе правядзеннем ускладаецца на дэкана гістарычнага факультэта, загадчыка кафедры гісторыі Беларусі і кіраўніка практык універсітэта.

Репозиторий ВГУ

Перад пачаткам практыкі праводзіцца ўстановачная канферэнцыя, падчас якой студэнты знаёмяцца з загадам, праграмай і графікам праходжання практыкі, да студэнтаў даводзяцца іх правы і абавязкі, агульныя патрабаванні да дакументацыі, якую неабходна прадставіць па выніках практыкі, праводзіцца інструктаж па тэхніцы бяспекі, кансультацыі па асноўных пытаннях праграмы.

Адзін са студэнтаў вучэбнай групы, замацаваны за канкрэтнай падгрупай, прызначаецца старастам. У яго абавязкі ўваходзіць улік працы студэнтаў, забеспячэнне дысцыпліны ў падгрупе, выкананне даручэнняў кіраўніка практыкі.

**Правы і абавязкі студэнтаў**

Студэнты ў перыяд правядзення практыкі маюць права:

- па ўсіх пытаннях, якія ўзнікаюць у працэсе практыкі, звяртацца да кіраўнікоў практыкі;
- уносіць прапановы ў пісьмовай форме па ўдасканаленні працэсу арганізацыі практыкі.

Студэнты ў перыяд правядзення практыкі абавязаны:

- выконваць у вызначаныя тэрміны ўсе віды заданняў і работ, прадугледжаных праграмай практыкі;
- штодзённа весці дзённік практыкі і прадстаўляць яго кіраўніку для праверкі;
- выконваць правілы тэхнікі бяспекі па месцы праходжання практыкі;
- падпарадкоўвацца правілам унутранага распарадку, выконваць распараджэнні кіраўніка практыкі і групавых кіраўнікоў-метадыстаў;
- у вызначаныя тэрміны здаць залік па практыцы.

**Патрабаванні бяспекі да студэнтаў у час правядзення паходу і экскурсіі**

Перад правядзеннем паходу, экспедыцыі, экскурсіі:

- да паходу дапускаюцца навучэнцы, якія прайшлі інструктаж па тэхніцы бяспекі, азнаёмлены з маршрутам, верагоднымі небяспечнасцямі і якія не маюць супрацьпаказанняў па стане здароўя;
- на студэнце павінна быць зручнае адзенне і абутак, якія не перашкаджаюць руху і адпавядаюць сезону і надвор'ю;
- у паходы забараняецца надзяваць упрыгожванні: завушніцы, бранзалеты, пярсцёнкі, каралі і інш.

Репозиторий ВГУ

**У час правядзення турыстычных мерапрыемстваў студэнт павінны**

- выконваць правілы тэхнікі бяспекі турыстычных паходаў, дысцыпліну, дакладна выконваць усе ўказанні кіраўніка практыкі, яго намесніка, групавых кіраўнікоў; не змяняць самастойна маршрут руху, які абвешчаны кіраўніком практыкі і месцазнаходжання групы, не пакідаць самавольна месца размяшчэння групы;
- выконваць правілы пажарнай бяспекі, асабістай бяспекі і аховы прыроды;
- з мэтай пазбягання заражэння страўнікава-вантробнымі захворваннямі забараняецца піць сырую ваду з адкрытых неправераных вадаёмаў; выкарыстоўваць для піцця можна толькі кіпячоную ці прадэзінфіцыраваную ваду;
- забараняецца спрабаваць на смак якія-небудзь расліны, плады і грыбы, есці снег і лядышкі. Забараняецца набліжацца да жывёл на небяспечную дыстанцыю, кранацца рукамі жывёл, атрутных і калючых раслін;
- забараняецца набываць і спажываць прадукты харчавання без узгаднення з кіраўніком;
- забараняецца спажываць алкагольныя напоі, табачную прадукцыю, атрымліваць падарункі і частаванні прадуктамі харчавання ад незнаёмых людзей;
- выконваць правілы асабістай гігіены. Тэрмінова інфармаваць кіраўніка групы аб пагаршэнні стану здароўя ці траўмах;
- паважаць мясцовыя традыцыі і звычаі. Беражліва адносіцца да прыроды, помнікаў гісторыі і культуры, асабістага і групавога рыштунку;
- пазбягаць канфліктных сітуацый між членамі групы, іншымі ўдзельнікамі мерапрыемстваў, мясцовым насельніцтвам.

**Патрабаванні бяспекі ў аварыйных сітуацыях**

- удзельнік паходу, экскурсіі, экспедыцыі, які адстаў ад групы ці згубіўся ў населеным пункце, павінны неадкладна звярнуцца ў дзяржаўную ўстанову (міліцыю, адміністрацыю, школу ці інш.);
- у аварыйных сітуацыях, непрадбачаных прыродных з’явах, сітуацыях, якія ўтрымліваюць пагрозу тэрарыстычнага акта, павінны старацца заставацца ў спакоі і мець вытрымку, бездакорна і дакладна выконваць усе ўказанні факультэцкага кіраўніка, а таксама службовых асоб.

Репозиторий ВГУ

## Абавязкі факультэцкага кіраўніка практыкі

Факультэцкі кіраўнік практыкі:

- распрацоўвае і прадстаўляе на зацвярджэнне загад і графік праходжання студэнтамі практыкі;
- у час правядзення практыкі адказвае за выкананне загаду рэктара і пры неабходнасці робіць прапановы па ўнясенні ў загад і графік практыкі змяненняў і дапаўненняў;
- кантралюе выкананне абавязкаў студэнтамі і групавымі кіраўнікамі-метадыстамі, адказвае за стан тэхнікі бяспекі;
- прымае справаздачную дакументацыю і выстаўляе залік па практыцы ў апошні дзень яе правядзення;
- пасля завяршэння практыкі прадстаўляе ў дэканат і на кафедру, адказную за правядзенне практыкі, агульную справаздачу аб выніках вучэбнай практыкі.

## Абавязкі групавых кіраўнікоў-метадыстаў

Групавы кіраўнік-метадыст:

- ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю замацаванай за ім групы студэнтаў;
- сочыць за выкананнем студэнтамі вучэбнай праграмы і графіку праходжання практыкі, аказвае метадычную дапамогу;
- арганізуе і кантралюе адпрацоўку прапушчаных студэнтамі заняткаў;
- правярае справаздачную дакументацыю і прадстаўляе факультэцкаму кіраўніку інфармацыю па правядзенні практыкі ў групе для складання агульнай справаздачы;
- выконвае распараджэнні факультэцкага кіраўніка практыкі.

Репозиторий ВГУ

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АФАРМЛЕННІ ДАКУМЕНТАЦЫІ

По завяршэнні гісторыка-краязнаўчай практыкі студэнт павінен прадставіць кіраўніку наступныя дакументы:

1) запоўнены і завераны **дзённік** практыкі адразу пасля яе завяршэння;
2) **індывідуальнае заданне**, якое вызначае кіраўнік;
3) пісьмовую **справаздачу**, якая павінна змяшчаць інфармацыю пра канкрэтна выкананую работу, вывады і прапановы па арганізацыі практыкі.

Асноўнай формай справаздачнай дакументацыі з'яўляецца **дзённік**, у якім адлюстроўваецца выкананая работа. Бягучая праверка дзённікаў праводзіцца на працягу практыкі групавымі кіраўнікамі-метадыстамі. Напрыканцы практыкі студэнты рыхтуюць **індывідуальныя заданні** – (падрыхтаваны камплект дакументаў для падання ў Міністэрства культуры з мэтай ўзяцця аб'екта пад ахову; гістарычныя даведкі на помнік гісторыі і культуры, падрыхтаваныя на аснове не менш 4–5 крыніц; правядзенне добраўпарадкавання прыроднага, гістарычнага аб'екта; распрацоўка экскурсіі, плана экспазіцыі верагоднага музею, інтэрнэт-старонкі, рэканструкцыя традыцыйных для мясцовасці абрадаў і інш.). Разам з навуковасцю ў індывідуальных заданнях ацэньваецца самастойнасць, арыгінальнасць мыслення, творчы падыход.

Сваё індывідуальнае заданне студэнт атрымлівае перад пачаткам практыкі, каб мець магчымасць больш грунтоўна падрыхтавацца да яго выканання. Індывідуальнае заданне выконваецца па тых аб'ектах, якія будуць наведаны ў час практыкі. Для аналізу могуць быць прапанаваны і іншыя аб'екты.

Пры афармленні індывідуальнага задання студэнт як спецыяліст гуманітарнага профілю павінен правільна аформіць тытульны аркуш і даць разгорнуты і абгрунтаваны адказ па ўсіх пунктах прапанаванага плана, а не абмяжоўвацца кароткімі адказамі (як пры запаўненні анкет).

Праграма практыкі прадугледжвае наступную тэматыку індывідуальных заданняў, якая можа быць дапоўнена пры наведванні ў час практыкі іншых, не ўключаных у гэты спіс аб'ектаў (*Гл. дадаткі*).

Акрамя дзённіка і індывідуальнага задання студэнт павінен падрыхтаваць **справаздачу па практыцы**. У справаздачы пазначаецца тэрмін праходжання практыкі, коратка характарызуюцца базы практыкі, вызначаюцца станоўчыя і адмоўныя моманты ў арганізацыі і правядзенні практыкі, даюцца рэкамендацыі па ўдасканаленню яе арганізацыі з абгрунтаваннем сваёй пазіцыі.

Завяршае практыку **выніковая канферэнцыя**, напярэдадні якой студэнты прадстаўляюць справаздачную дакументацыю. На канферэнцыі

Рэпазіторый ВДУ

аналізуюцца і абагульняюцца вынікі працы. *Па выніках работы* студэнта ў час практыкі і *пры наяўнасці справаздачнай дакументацыі*, якая адпавядае прад'яўляемым патрабаванням, выстаўляецца **залік**.

Калі студэнт па якой-небудзь прычыне не змог наведаць месца правядзення экскурсіі з групай, ён павінен гэта зрабіць у індывідуальным парадку па ўзгадненні з кіраўнікамі практыкі. Пры гэтым адпрацоўка прапушчаных без уважлівых прычын заняткаў адбываецца ў адпаведнасці з універсітэцкім палажэннем "Аб частковым вяртанні сродкаў, затрачаных універсітэтам на правядзенне вучэбнай работы па-за раскладам" і прадугледжвае выкананне дадатковага індывідуальнага задання. Дакументам, які пацвярджае індывідуальнае наведванне месца экскурсіі, з'яўляецца квіток адпаведнай установы і пісьмовая справаздача студэнта. Для спрашчэння працы студэнтаў у індывідуальным парадку ў выданні падрыхтаваны пералік асноўных музеяў, якія могуць быць наведаны, з указаннем іх размяшчэння і кантактных тэлефонаў (гл. *дадатакі*).

У час правядзення практыкі студэнт абавязаны весці **дзённік** ці рабіць чарнавыя запісы ў нататнік, якія затым стануць асновай для напісання дзённіка. Усе аб'екты, якія будуць наведаны на працягу практыкі, павінны быць апісаны ў дзённіку па наступным плане:

1. Дата. Маршрут руху. Транспарт.
2. Гісторыка-культурныя, прыродныя каштоўнасці. Арганізацыі і ўстановы, прадпрыемствы. Асноўная інфармацыя па аб'ектах.
   - Дата ўзвядзення
   - Стыль. Архітэктар
   - Адметныя рысы
   - Статус
   - Валадары
   - Гістарычная даведка
   - Сучасны стан. Верагодныя неабходныя меры па захаванні
3. Асабістая ацэнка. Вывады.

Студэнт, які **не выканаў** праграму практыкі ці не здаў неабходную дакументацыю, накіроўваецца **на паўторнае індывідуальнае** праходжанне практыкі **па-за сеткай раскладу вучэбных заняткаў**.

Репозиторий ВГУ

## ДАДАТКІ

**Прыкладны план правядзення гісторыка-краязнаўчай практыкі**
студэнтаў 1 курса дзённага аддзялення гістарычнага факультэта
спецыяльнасці «Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны»

1 дзень.

**Установачная канферэнцыя** па практыцы (тлумачэнне мэтаў, задач і зместу практыкі, кіраўнікі практыкі даюць рэкамендацыі па вядзенні дакументацыі). Правядзенне інструктажу па тэхніцы бяспецы. Наведванне музея СШ № 25, музея Ганаровых грамадзян № 12. Экскурсія ў в. Баронікі. Агляд гарадзішча часоў ранняга жалезнага веку, абарончых збудаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, поймы р. Лучоса).

2 дзень.

**Экскурсія ў г. Полацк.** Агляд музея старажытнай архітэктуры Сафійскага сабора, Дзіцячага музея, славутых месцаў горада: Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра, Сафійскага сабора, замчышча, забудовы вуліцы Ніжне-Пакроўскай; помнікаў Усяславу Брачыславічу, Сімяону Полацкаму, Андрэю Полацкаму, літары "Ў", знака "Цэнтр Еўропы" і інш.

3 дзень.

**Экскурсія па маршруце: Віцебск – чыг.ст. Залучча – т/б "Лосвіда"** (помнік прыроды "Вялікі камень Залучскі", "Напалеонаўская дарога", дуб-волат каля в. Пруднікі, батанічны заказнік "Дубрава", турбаза "Лосвіда", зона адпачынку "Лосвіда" і інш.

4 дзень.

**Экскурсія па маршруце: Віцебск – г. Гарадок – в. Стайкі** (наведванне краязнаўчага музея, агляд забудовы XIX – пач. XX ст., паштовай станцыі сяр. XIX ст., помнікаў і памятных месцаў, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, пам. знака ў гонар паэмы "Тарас на Парнасе".

5 дзень.

**Экскурсія па маршруце: Віцебск – ст. Лётцы – в. Лукі – в. Вялікія Лётцы** (санаторый і зона адпачынку "Лётцы", гарадзішча жалезнага веку, курганны могільнік, "Цуда-дрэва", каменныя крыжы, былая сядзіба роду Астрэйкаў у в. Лукі, былая сядзіба Ул. Адамава ў в. Вялікія Лётцы, затон, батанічны заказнік "Прыдзвінне".

6 дзень.

**Аглядная экскурсія па г. Віцебску** з аглядам помнікаў гісторыі і культуры XII–XIX стст. Наведванне Віцебскага абласнога краязнаўчага

Репозиторий ВГУ

музея, музея кіно, музеяў кафедры анатоміі ВДМУ і экспазіцый музеяў кафедраў акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

7 дзень.

**Экскурсія ў в. Копці Віцебскага раёна**. Знаёмства з памятным мемарыялам у гонар 60-годдзя Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг. Вывучэнне досведу дзейнасці мясцовых краязнаўцаў.

8 дзень.

**Экскурсія на радзіму П.М. Машэрава по маршруце: Віцебск – ст. Лычкоўскага – в. Шыркі – в. Александрова – в. Обаль – в. Машканы** (знаёмства з музеем славутых землякоў, прыродна-геаграфічнымі комплексамі Беларускага Паазер'я, у тым ліку даліна ракі Обаль, дубам-волатам каля в. Александрова, памятнымі мясцінамі, звязанымі з жыццём П.М. Машэрава, драўлянай царквой Св. Уладзіміра).

9 дзень.

**Экскурсія па маршруце: Віцебск – в. Сакольнікі – в. Мазалава, м. "Мілае" – в. Лужасна** (курганны могільнік "Кахоўка", сядзіба І. Манькоўскага "Мілае", царква Узвіжання Крыжа, царква Узнясення, будынкі былой Земляробчай школы, музей Лужаснянскага аграрнага каледжа, спартыўны комплекс Віцебскага кадэцкага вучылішча і інш.).

10 дзень.

**Аглядная экскурсія па г. Віцебску** з аглядам помнікаў гісторыі і культуры XX ст. Наведванне выставачнага цэнтра "Духаўскі круглік", музея Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова, Выставачнай залы абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, музея спажыўкааперацыі пры Віцебскім аблспажыўсаюзе.

11 дзень.

**Экскурсія ў г. Оршу.** Агляд этнаграфічнага музея "Млын" і літаратурнага музея Ул. Караткевіча; славутых месцаў горада (замчышча, калегіўма езуітаў, Куцеінскага манастыра; помнікаў К. Заслонаву, Ул. Караткевічу, дзіцячага парку, мемарыяльнага комплексу "Кацюша" і інш.).

12 дзень.

**Экскурсія па маршруце: Віцебск – р.п. Руба – музей-сядзіба "Здраўнёва"** (наведванне сядзібы І.Я. Рэпіна "Здраўнёва", даламітавага кар'ера "Гралёва", школьнага музея "Памяць", адзінага ў Беларусі месца вырастання вадзянога імха *Cinclidotus Danubicus*.

Завяршэнне афармлення дакументацыі. Правядзенне выніковай канферэнцыі і выстаўленне заліку.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ЗАДАННЯЎ

1. Помнікі гісторыі і культуры в. Лескавічы Шумілінскага раёна
2. Помнікі гісторыі і культуры г.п. Обаль Шумілінскага раёна
3. Помнікі гісторыі і культуры г. Гарадка
4. Помнікі гісторыі і культуры г.п. Лёзна
5. Замак "Белы Ковель" у в. Смаляны Аршанскага раёна
6. Помнікі гісторыі і культуры в. Смаляны Аршанскага раёна
7. Гісторыя ўзвядзення і аднаўлення помнікаў, прысвечаных вайне 1812 г. у Полацку
8. Помнікі Полацка
9. Помнікі Віцебска
10. Вуліца Замкавая ў Віцебску
11. Вуліца Суворава ў Віцебску
12. Вуліца Леніна (ад плошчы Перамогі да плошчы Свабоды)
13. Кафэ і рэстараны Віцебска
14. Паркі і скверы горада Віцебска
15. Месцы адпачынку Віцебска
16. Садова-паркавая скульптура Віцебска
17. Помнікі прыроды Віцебскага раёна
18. Батанічны заказнік "Чортава барада"
19. Юр'ева горка: гісторыя мікрарэгіёну і рэкрэацыйныя магчымасці зоны адпачынку ў г. Віцебску
20. Экскурс па адным з раёнаў Віцебска (ДСК, Поўдзень, Маркаўшчына, Пескавацік, Ціраспаль, Білева, Журжава і інш.)
21. Турыстычныя рэсурсы в. Старае Сяло Віцебскага раёна і яго наваколляў
22. Турыстычныя рэсурсы наваколляў возера Лосвіда
23. Турыстычныя рэсурсы наваколляў в. Лётцы
24. Турыстычныя рэсурсы в. Лужасна
25. Турыстычныя рэсурсы в. Мазалава
26. Турыстычныя рэсурсы в. Падбярэззя і наваколляў
27. Турыстычныя рэсурсы г.п. Шуміліна
28. Турыстычныя рэсурсы в. Заронава
29. Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна "Здраўнёва"
30. Жыццё і дзейнасць выдатнага мастака І.Я. Рэпіна
31. "Віцебскі" перыяд жыцця і творчасці І.Я. Рэпіна
32. І. Манькоўскі і сядзіба "Мілае"
33. У. Адамаў і сядзіба "Вялікія Лётцы"
34. Віцебскія замкі
35. Сядзібы Віцебшчыны
36. Паркі Віцебшчыны
37. Турыстычныя аб'екты г. Полацка

Репозиторий ВГУ

38. Турыстычныя аб’екты г. Оршы
39. Турыстычныя аб’екты г. Гарадка
40. Турыстычныя рэсурсы Гарадоцкага раёна
41. Экскурсія па г.п. Шуміліна і наваколлях
42. Турыстычныя рэсурсы Шумілінскага раёна
43. Экскурсія па г. Сянно
44. Турыстычныя рэсурсы Сенненскага раёна
45. Экскурсія па г.п. Лёзна
46. Турыстычныя рэсурсы Лёзненскага раёна
47. Экскурсія па г. Полацку
48. Турыстычныя рэсурсы Полацкага раёна
49. Турыстычныя рэсурсы Бешанковіцкага раёна
50. Турыстычныя рэсурсы Віцебскага раёна
51. Турыстычныя рэсурсы г.п. Руба і наваколляў
52. Фёдар Махноў – самы вялікі чалавек у свеце
53. Праваслаўныя храмы Віцебска
54. Свята-Прачысценскі (Успенскі) храм Віцебска
55. Віцебская Дабравешчанская (Звеставання) царква
56. Пакроўскі храм у г. Віцебску і комплекс былога трынітарскага кляштара
57. Уваскрасенская (Рынкавая) царква ў Віцебску
58. Каталіцкія храмы Віцебска: гісторыя і сучаснасць
59. Касцёл Святой Барбары ў Віцебску
60. Віцебскі абласны краязнаўчы музей
61. Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова
62. Віцебскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў
63. Выставачная зала Цэнтра народных рамёстваў “Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна” (“Задзвінне”)
64. Музеі Полацка
65. Музей гісторыі старажытнай архітэктуры Сафійскага сабора
66. Музей Беларускага кнігадрукавання ў Полацку
67. Этнаграфічны музей “Млын” у Оршы
68. Літаратурны музей Уладзіміра Караткевіча ў Оршы
69. Музей гісторыі і культуры Аршаншчыны
70. Гарадоцкі краязнаўчы музей
71. Шумілінскі краязнаўчы музей

Репозиторий ВГУ

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ Ў ДАПАМОГУ СТУДЭНТУ


1. Асіноўскі С.М. Орша: Залатыя стрэлы на блакітным полі: храналаг. даведнік. – Мн.: Полымя, 1997. – 428 с.
2. Бандарэвіч В.В. Экскурсія да вытокаў г. Сянно: Краязнаўчы маршрут па раённым цэнтры Віцебскай вобласці. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2000. – 216 с.
3. Бруева Л. Пока не похоронен последний солдат (из истории поискового движения в Витебской области): справочное издание. – Орша: Оршанская типография, 2009. – 496 с.
4. Бубенько Т.С. Средневековый Витебск. Посад – Нижний замок (X – первая половина XIV в.). – Витебск: УО "ВГУ им. П.М. Машерова", 2004. – 276 с.
5. Бурдо А. Не предай забвению! Малоизвестные страницы войны (из опыта поисковой работы). – Витебск: Диджитал-Экспресс, 2008. – 90 с.
6. Былички Белорусского Поозерья: сборник текстов / сост.: В.Н. Поклонская, О.В. Лопатинская. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. – 74 с.
7. Визитная карточка Полоцкого района. – Полоцк: А.И. Судник, 2005. – 24 с.
8. Витебск: энциклопедический справочник. – Мн.: БелСЭ, 1988. – 408 с.
9. Витебская милиция. Годы и люди / ред.-сост. В.И. Пахомова. – Витебск: УВД Витебского облисполкома, 1998. – 174 с.
10. Витебский район: туризм и отдых / серия «Жемчужины Беларуси» / [автор текста Пивовар Н.В., перевод с бел. языка]. – Мн.: Рифтур, 2014. – 48 с.
11. Витебщина приглашает: каталог агроусадеб области. – Новополоцк: изд. О.В. Молодечкин, 2010. – 135 с.
12. Віцебск. Ландшафты памяці: матэрыялы конкурсу гісторыка-культурных інтэрпрэтацый / уклад. Р. Воранаў. – Віцебск, 2010. – 32 с.
13. Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І.А. Абрамава [і інш.]; уклад. М.В. Півавар. – Мінск: Паркус плюс, 2008. – 328 с.
14. Газин Д.Р. Лужеснянские страницы. – Витебск: Витебская областная библиотека, 2002. – 94 с.
15. Газин Д.Р. По репинским местам Придвинья. – Витебск: Витебская областная типография, 2003. – 80 с.
16. Газин Д.Р. Сапуновские сокровища. – Витебск: Витебская областная укрупненная типография, 1998. – 42 с.
17. Газін Д.Р. Вярхоўскія парогі-перакаты. – Віцебск: друк. імя Камінтэрна, 1994. – 14 с.
18. Газін Д.Р. Мазалаўская Швейцарыя. – Віцебск: друк. імя Камінтэрна, 1992. – 8 с.
19. Газін Д.Р. Цірaспальскія шляхі-дарогі. – Віцебск: друк. імя Камінтэрна, 1995. – 18 с.
20. Джумантаева Т.А. Музеі Полацка ў культурнай прасторы горада: аўтарэферат дыс. … канд. культуралогіі: 13.00.01. – Полацк: НПДКМЗ, 2009. – 23 с.
21. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В.Я. Абламскі, І.М. Чарняўскі, Ю.А. Барысюк. – Мн.: БЕЛТА, 2009. – 684 с.
22. Дорофеенко Н.И., Акентьев Г.М., Глинка Т.И., Скопа В.Г. Юные герои Витебщины. – Мн.: Народная асвета, 1980. – 127 с.
23. Дук Д.У. Полацк XVI–XVIII ст.: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.
24. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринтное воспроизведение издания 1882 г. (под редакцией Семенова П.П. – Т. 3. – СПб., М., 1882. – 490 с.). – Мн.: БелЭн, 1994. – 550 с.
25. Жуковский В.В. Оршеведение: производственно-практическое издание. – 2 изд. – Орша: Оршанская типография, 2009. – 208 с.


Репозиторий ВГУ

26. Жучкевич В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. – Мн., 1974. – 448 с.
27. Забелло Л. История витебского трамвая. – Витебск: ВОУТ им. Коминтерна, 1998. – 128 с.
28. Западная Двина – Даугава. Река и время / Л.С. Аносова [и др.]. – Мн.: Беларуская навука, 2006. – 270 с.
29. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мн.: БСЭ, 1985. – 496 с.
30. Иванов В.А. Замки Витебской земли. – Витебск, 2003. – 44 с.
31. Каліноўскі І. Полацк і яго ваколіцы. – Мн.: Вышэйшая школа, 2005. – 143 с.
32. Карасёў В. Па гістарычных мясцінах Полацкай зямлі. – Мн.: Пачатковая школа, 2011. – 72 с.
33. Карта-путеводитель Полоцко-культурной зоны. – Мн., 2007.
34. Квітней, мой горад над Дзвіною: зборнік твораў пра Віцебск / уклад. Л.М. Амбразевіч. – Віцебск: самвыдат, 2000. – 192 с.
35. Кішык Ю.Н. Панарама старога Віцебска. – Мн., 1995. – 139 с.
36. Клаз І.С. Па Дзвіне на вёслах. Нарыс. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1975. – 144 с.
37. Короткевич В.Б. Памятники истории Витебска. – Мн.: Полымя, 1975. – 24 с.
38. Кудзін А.М. Храналогія гісторыі Оршы. – Орша: Аршанская друкарня, 1992. – 102 с.
39. Кузьміч М.П., Сцепаненка М.І. Нашы землякі ў далёкім і блізкім замежжы: біяграфічны даведнік. – Віцебск: ВАД, 2007. – 208 с.
40. Кулажанка Л., Мальдзіс А., Сачанка С. Літаратурныя мясціны Беларусі: Краязнаўчы даведнік: У 3-х кнігах. Кн.1: Брэсц., Віцеб. і Гомел. вобл. – Мн.: БелЭн, 2000. – 288 с.
41. Левко О.Н. Витебск XIV–XVIII вв. – Мн.: Наука и техника, 1984. – 120 с.
42. Левко О.Н. Экскурсия по древнему Витебску. – Мн.: Полымя, 1984. – 32 с.
43. Легенды і паданні / склад. М.Я. Грынблат і А.І. Гурскі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.
44. Легенды і паданні Аршаншчыны / уклад. Л. Анісовіч. – Орша: Цэнтр імя Філона Кміты, 2004. – 61 с.
45. Легенды і паданні Віцебшчыны. Зборнік матэрыялаў абласнога конкурса “Легенды і паданні роднага краю” / склад. Н. Зайцава. – Віцебск, 2002. – 143 с.
46. Мой родны край – Аршаншчына. Гісторыка-краязнаўчы зборнік для пачатковага азнаямлення / аўт.-склад.: Т.М. Вароніна, А.М. Шышкевіч. – Віцебск: Віцебская друкарня, 2000. – 160 с.
47. Новополоцк. Путеводитель / сост. А.И. Судник. – Полоцк: Полоцкое книжное издательство, 2010. – 42 с.
48. Озера Белоруссии / под ред. О.Ф. Якушко. – Мн.: Ураджай, 1988. – 216 с.
49. Орша: памятные места / И. Ершов, Г. Распопова. – М.: Турист, 1986. – 15 с.
50. Очарование Миорского края / В.А. Ермалёнок, П.И. Боголей. – Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2007. – 50 с.
51. Память: историко-документальная хроника Шумилинского района. – Мн.: БелСЭ, 1985. – 520 с.
52. Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / уклад. У.І. Мезенцаў. – Мн.: Маст. літ., 2004. – 772 с.
53. Памяць: Гарадоцкі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў / уклад. С.У. Садоўская. – Мн.: Беларусь, 2004. – 894 с.
54. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. – Кн. 1. – Мн.: БелЭн, 2002. – 648 с.
55. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Віцебск: у 2-х кн. – Кн. 2. – Мн.: БелЭн, 2003. – 680 с.

Репозиторий ВГУ

56. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка горада Полацка. – Мн.: БелЭн, 2002. – 912 с.
57. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Лёзненскага раёна. – Мн.: БелЭн, 1992. – 592 с.
58. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Полацкага раёна. – Мн.: Вышэйшая школа, 1999. – 700 с.
59. Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 1. – Мн.: БелЭн, 1999. – 384 с.
60. Памяць: Гісторыка-культурная хроніка Оршы і Аршанскага раёна: у 2 кн. Кн. 2. – Мн.: БелЭн, 2000. – 528 с.
61. Пахомов Н.И., Дорофеенко Н.И., Дорофеенко Н.В. Витебское подполье. – Минск: Беларусь, 1974. – 248 с.
62. Пивовар Н.В. Маршрутами Придвинья. – Витебск: Обл. комитет по спорту и туризму, 2007. – 16 с.
63. Пивовар Н.В. Туристско-краеведческие походы и экскурсии в окрестностях Витебска / Н.В.Пивовар. – Витебск, 2002. – 116 с.
64. Півавар М.В. Краязнаўцы Віцебшчыны 2-й пал. XX – пач. XXI ст. – Мінск: Кнігазбор, 2010. – 372 с.
65. Півавар М.В. Методыка выяўлення і рэгістрацыі помнікаў прыроды ў краязнаўчай працы. – Віцебск, 1999. – 32 с.
66. Півавар М.В. Музеі Віцебска на пачатку XXI ст.: манаграфія. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава, 2012. – 180 с.
67. Плавінскі М. Юр'ева горка з арліных вышынь. – Віцебск: друк. імя Камінтэрна, 1994. – 13 с.
68. Подлипский А. Ботаник Владимир Адамов. – Витебск: обл. типография, 2000. – 32 с.
69. Подлипский А. Великан Федор Махнов. – Витебск: тип. им Коминтерна, 1993. – 32 с.
70. Подлипский А. Губернаторский дворец в Витебске. – Витебск: тип. им. Коминтерна, 1990. – 4 с.
71. Подлипский А. Еврейские адреса Витебска: путеводитель. – Витебск: Вит. обл. тип., 2013. – 96 с.
72. Подлипский А. Памятник героям Отечественной войны 1812 года в Витебске. – Витебск: тип. им. Коминтерна, 1990. – 4 с.
73. Подлипский А., Рогач В. Доски, берегущие память: справочник. – Витебск.: Витеб. обл. тип., 2006. – 95 с.
74. Подлипский А.М. Евреи в Витебске. В 2-х т. – Т.1. – Витебск: УПП "Витебская областная типография", 2004. – 176 с.
75. Полацк музейны. Фотаальбом / аўт.-уклад. Т.А. Джумантаева, М.М. Ільніцкі. – Мн.: Беларусь, 2006. – 283 с.
76. Поляков С.И. Полоцкий кадетский корпус. История в лицах. – Полоцк: Полоцкое книжное издательство: Спасо-Евфросиньевский женский монастырь в г. Полоцке, 2010. – 71 с.
77. Поляков С.И., Копыл С.П. "Линия Сталина". Полоцкий укрепрайон, 1919–1941 гг. – Полоцк: Полоцкое книжное издание, 2009. – 55 с.
78. Радомская Л. Уладзімір Караткевіч і Орша. – Орша: Абласная друкарня. 1998. – 48 с.
79. Русецкий А.В., Русецкий Ю.А. Художественная культура Витебска с древности до 1917 года. – Мн.: БелЭн., 2001. – 288 с.
80. Русецкі А.У. Вывучаць і ведаць гісторыю Віцебска. – Віцебск: ВДУ, 2000. – 38 с.
81. Русецкі А.У. Мастацкая культура Аршанскай зямлі ў XI – XIX стст. – Мн.: БелЭн., 2002. – 232 с.
82. Санаторий "Лётцы". Буклет. – Б.м., б.г.

Репозиторий ВГУ

83. Семянькова Г.К. Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны: структура, семантыка, геаграфія: аўтарэф. дыс. … канд. філалаг. навук: спец 10.02.01 – бел. мова; БДПУ імя М. Танка. – Мн., 2002. – 21 с.
84. Федарук А. Культурна-гістарычная каштоўнасць і сучасны стан шляхецкіх сядзіб Віцебшчыны // Віцебскі сшытак. – 2000. – №. 4. – С. 84–89.
85. Физическая география Витебской области: учебное пособие / Бобрик М.И., Гаврильчик З.С., Галкин А.Н. и др. – Витебск: Издательство ВГУ им. П.М. Машерова, 2004. – 222 с.
86. Хмельницкая Л. Витебск. Путеводитель. – Мн., 2003. – 74 с.
87. Хмельницкая Л.В. Прогулки со старой картой: очерк истории Витебска начала XX века. – Витебск: Вит.обл.тип., 2012. – 120 с.
88. Хронология истории г. Витебска / сост. Л.Д. Кузьменко, А.М. Подлипский. – Мн.: Полымя, 1987. – 48 с.
89. Цішкін І.А. Віцебск. Страчаная прыгажосць горада. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2002. – 48 с.
90. Цішкін І.А. Віцебскія замкі. – Віцебск: Віцебская абласная друкарня, 2003. – 16 с.
91. Чарняўская Т.І. Архітэктура Віцебска: з гісторыі планіроўкі і забудовы горада. – Мінск: Навука і тэхніка. – 102 с.
92. Шынкевіч А.М. Аршанская даўніна. – Мн.: Полымя, 1992. – 112 с.
93. Шынкевіч А.М. Аршаншчына старажытная. – Орша: Аршанская друкарня, 1990. – 19 с.
94. Шынкевіч А.М. Аршаншчына ў адлюстраванях. – Орша: Аршанская тыпаграфія, 1994. – 37 с.
95. Шынкевіч А.М. Орша: взгляд в прошлое. – Орша: Оршанская типография, 1992. – 26 с.
96. Юшкевич М.Д. Генерал от ковалерии И.А. Андриянов. Очерки из жизни. – Витебск: ВОТ, 2009. – 90 с.
97. Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. – Wyd. 2. – Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. – T. 1. Województwa mińskie, mścisławskie, połockie, witebskie. – Wrocław: Ossolineum, 1996. – 335 S.
98. Słownik geograficzny Królewstwa Polskiego i innych krajów slowjañskich / T.1–15. Warszawa, 1880–1900 / Słownik Geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. [Электронны рэсурс]. Chicago: Polish Genealogical Society of America, 2002. Рэжым доступу: CD-disc.

***Энцыклапедыі і даведнікі***

99. Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыкл. давед. / Рэдкал.: У.М. Жук. – Мн.: БелЭн, 2001. – 496 с.
100. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Мн.: БелЭн, 1996–2001. – Т. 1–13.
101. Беларусь: Энцыкл. давед. – Мн.: БелЭн, 1995. – 799 с.
102. Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўн.: У 6 т. – Мн.: БелЭн, 1992–1995.
103. Блакітны скарб Беларусі: Рэкі, азёры, вадасховішчы, турысцкі патэнцыял водных аб’ектаў. – Мн.: БелЭн, 2007. – 480 с.
104. Туристские регионы Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]. – Мн.: Бел. Энциклоп. им. П. Бровки, 2008. – 608 с.
105. Туристская энциклопедия Беларуси / редкол.: Г.П. Пашков [и др.]; под общей редакцией И. И. Пирожника. – Минск: «Белорусская Энциклопедия имени Петруся Бровки», 2007. – 650 с.
106. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мн.: БелЭн, 1993– 2001.
107. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. – Мн.: БелСЭ, 1984–1987.
108. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.

Рэпазіторый ВДУ

## Артыкулы ў перыядычным друку

Спіс скарачэнняў:

АГ Аршанская газета
АіС Архівы і справаводства
БЗ Браслаўская звязда
БМ Беларуская мінуўшчына
ВГл Вольнае Глыбокае
ВК Витебский курьер
ВР Віцебскі рабочы
Лкр Лепельскі край
ЛП Ленінская праўда
НС Народнае слова
ПгіКБ Помнікі гісторыі і культуры Беларусі
РВ Родныя вытокі
СП (М) Сцяг перамогі

### *Гісторыя Віцебска*

1. Абрамова И. Замки Витебска // ВК. – 1997. – № 47. – С. 3
2. Абрамова И. Предместья Витебска // ВК. – 1997. – № 51 (26.09, 8.10.)
3. Абрамова И. Чертёж Витебска 1664 г. // ВК. – 1998. – № 29. – С. 3
4. Абрамова И. Когда же всё-таки был основан Витебск // ВК. – 1998. – 15.05.
5. Абрамова И. Первый дантист России был из Витебска // ВК. – 1998. – 28.08.
6. Абрамова И. Церковно-археологическое древлехранилище // ВК. – 1998. – 13.12.
7. Абрамова И. Умчалось время золотое [Полацк. жаночае духоўнае вучылішча] // ВК. – 1999. – № 5. – С. 3
8. Абрамова И. Хутор с ветряной мельницей // ВК. – 1999. – № 14. – С. 3
9. Абрамова И. Из истории витебского окружного суда // ВК. – 1999. – № 27. – С. 3.
10. Абрамова И. Мосты в Витебске // ВК. – 1999. – № 37. – С. 3.
11. Абрамова И. Витебские юродивые // ВК. – 1999. – 06.11.
12. Абрамова И. 100 грамм в “разувайке” // ВК. – 2000. – № 4. – С. 3.
13. Абрамова И. Гуторовщина // ВК. – 2000. – № 14. – С. 3.
14. Абрамова И. Витебские богадельни // ВК. – 2000. – № 47. – С. 3.
15. Абрамова И. Минеральные источники Витебской губернии // ВК. – 2000. – 28.08.
16. Абрамова И. Долгожители Витебской губернии // ВК. – 2000. – № 69 (12.09.). – С. 3.
17. Абрамова И. Витебский цирк // ВК. – 2004. – № 59 (6.08.). – С. 4.
18. Віцебскі летапіс Панцырнага і Аверкі // Спадчына. – 1997. – № 4. – С. 209–239.
19. Крэпак Б. Віцебскі авангард [фота Малевіча, Лісіцкага, Шагала] // Спадчына. – 1991. – № 4. – С. 30.
20. Подлипский А. Александр Невский в Витебске не венчался // НС. – 1992. – № 127 (16.10.). – С. 4.
21. Подлипский А. Срывая листки календаря [ВВАК, вул. Леніна, 14] // НС. – 1999. – № 80 (13.07.). – С. 5.
22. Рукописи не горят, береста не гниет [Віцебск у пісьмовых крыніцах] // НС. – 2003. – № 106 (6.09.). – С. 6.
23. Старонкі полацкага летапісу [Чамярыцкі В.] // Спадчына. – 1990. – № 2. – С. 42–44.

### *Помнікі гісторыі і культуры*

24. Абрамова И. Орёл над Витебском [помнік 1812 г.] // ВК. – 2002. – № 83 (29.10.). – С. 3.
25. Абрамова И. Старые дома. Улица Советской Армии, 8, 10 // ВК. – 2004. – № 86. – С. 3.
26. Абрамова И. Старые дома. Ленина, 74 // ВК. – 2004. – № 91. – С. 3.

Репозиторий ВГУ

27. Абрамова И. Старые дома. Окружной суд // ВК. – 2005. – № 10 (8.02.). – С. 3.
28. Абрамова И. Вид с открытки № 107 [вул. Савецкая] // ВК. – 2005. – № 37. – С. 3.
29. Абрамова И. Вокзал // ВК. – 2005. – № 43. – С. 3.
30. Абрамова И. Старые дома, ул. Чехова, д. 11 // ВК. – 2005. – № 53. – С. 4.
31. Абрамова И. Памятник Ленину // ВК. – 2005. – № 56. – С. 3.
32. Абрамова И. Была в Витебске Красная площадь, но без Мавзолея… // ВК. – 2005. – № 63. – С. 3.
33. Абрамова И. Ул. Кирова // ВК. – 2005. – № 78. – С. 3.
34. Абрамова И. Крестьянский поземельный банк // ВК. – 2005. – № 85. – С. 4.
35. Абрамова И. Юрьева горка // ВК. – 2005. – № 94. – С. 4.
36. Падліпскі А. Нашчадкі памятаюць [помнікі вайне 1812 г. на Віцебшчыне] // ВР. – 1988. – № 190. – С. 4.
37. Подлипский А. В первый послевоенный год [Віцебск] // НС. – 2005. – № 104. – С. 4.
38. Падліпскі А. Помнік на Успенскай горке // НС. – 1992. – № 113. – С. 4.
39. Подлипский А. Марков монастырь // Віцьбічы. – 1991. – № 27. – С. 7.
40. Подлипский А. Марииниинская гимназия // НС. – 2000. – № 93. – С. 6.
41. Подлипский А. Крестьянский поземельный банк [будынак на вул. Леніна] // НС. – 2003. – № 59. – С. 6.
42. Подлипский А. Я поведу тебя в музей [музеі Віцебска] // НС. – 2001. – № 55. (17.05.). – С. 5.
43. Падліпскі А. Коласаўскія мясціны на Віцебшчыне // НС. – 2002. – № 129. – С. 4.
44. Подлипский А. Крестьянский поземельный банк [будынак на вул. Леніна] // НС. – 2003. – № 59. – С. 6.
45. Подлипский А. Рукописи не горят, береста не гниет [Віцебск у пісьмовых крыніцах] // НС. – 2003. – № 106 (6.09.). – С. 6
46. Подлипский А. Улица Ленина, 18 [гісторыя дома] // Віцьбічы. – 1991. – № 42. – С. 4.
47. Подлипский А. Льва Толстого, 4 // Віцьбічы. – 1991. – № 44. – С. 4.
48. Подлипский А. Витебск, ул. Гоголя, 6 // НС. – 1991. – № 52, 57.

### *Храмы*

49. Абрамова И. Благовещенская единоверческая церковь // ВК. – 2000. – № 22. – С. 3
50. Абрамова И. Богоявленская церковь // ВК. – 2000. – № 34 (5.05.). – С. 4.
Экскурсия начинается уже на крыльце музея, ведь в этом здании – памятнике гражданской архитектуры конца XIX – начала XX в. – с 1925 года размещался родильный дом, в котором 26 ноября 1930 года и появился на свет будущий писатель.

В двух просторных залах на первом этаже здания разместилась музейная экспозиция под общим названием «Портрет писателя и человека».

Центральную часть экспозиции первого зала занимает творческая мастерская писателя – фрагмент кабинета его минской квартиры. В 2005 году к 75-летию Короткевича был открыт второй зал, посвящённый литературному наследию нашего земляка. Здесь царит возвышенная и романтическая атмосфера, ведь по стилю своего творчества Владимир Короткевич был писателем-романтиком. Внутри экспозиции находится научно-исследовательский центр. Он включает научную библиотеку, методические материалы, рабочее место исследователя.

Сегодня в экспозиции представлено около 640 предметов. Самые ценные из них – личные вещи писателя, рукописи его произведений, рисунки Короткевича-художника.

В архиве музея – интересные тематические экскурсии, музейные занятия, видеотека фильмов о Короткевиче и фильмов, снятых по его сценариям.

Музей активно участвует в международных выставочных проектах, сотрудничает с Японией, Польшей, Литвой, Украиной, Россией, Германией, Швецией. На базе музея состоялись две Международные научные конференции, посвящённые творчеству Владимира Короткевича.

После посещения музея В. Короткевича мы перемещаемся в детский парк. Он находится совсем недалеко, а по пути видим **памятник В.И. Ленину.** Авторами его являются скульптор Г. Муромцев и архитектор Ю. Козаков. Установлен он был 7 ноября 1987. Это последний памятник Ленину, установленный в Беларуси и во всём бывшем СССР.

Мы находимся на территории **детского парка**. Парков с такой спецификой не много в Беларуси. Во время подготовки к фестивалю «Дожинки–2008» был реконструирован детский парк. Стоимость реконструкции составила 17 миллиардов белорусских рублей. Парк

Репозиторий ВГУ

был введен в действие осенью 2008 года и сразу стал любимым местом детей и молодежи города. В одном из интервью «Аршанскай газеце» директор парка Владимир Осипов рассказал: «В парке установлено 12 современных аттракционов итальянского, российского и совместного белорусско-итальянского производства открытого типа. Эксплуатироваться они будут сезонно. Смотрите, прямо напротив входа расположился Гулливер с лилипутом на руке – его видно еще с площади. При входе в парк увидите станционного смотрителя, у него в руке находится колокольчик. Который, кстати, рабочий. Можете потереть ему ус и будет вам счастье. Чуть дальше «Лиса и Журавль», «Крокодил Гена и Чебурашка» и даже Волька со своим верным джином, только что освободившегося из волшебной лампы.

На противоположном берегу Днепра находится мемориальный комплекс **«За нашу Советскую Родину!»**, который мы посетим. Возведен он по проекту архитекторов В. Занковича, Ю. Градова, Л. Левина и Г. Горанского и открыт в 1966 году на Могилёвской улице, у моста, в память о том, что 14 июля 1941 года артиллерийская батарея из семи установок БМ-13 «Катюша» под командованием капитана И.А. Флёрова впервые отрыла огонь из этого смертоносного оружия против немецких войск.

Затем мы направляемся к той части города, в которой сохранились следы древней Орши. По левую руку находится здание в котором когда-то была почта. Перейдя через дорогу и зайдя на современный мостик мы можем видеть мост старой постройки – однопролётная арочная конструкция из красного кирпича на бутовом фундаменте. Отдельные детали – парапет со стрельчатыми проемами. Щиты по сторонам арки придают постройке псевдоготические черты. Мельница с мостом – памятник промышленной архитектуры Беларуси того времени.

Древнейшим памятником на территории города является **городище**, расположенное в его центральной части. Местоположение городища не случайно. Оно занимает мыс при впадении р. Оршицы в р. Днепр, является градоформирующим центром, от которого расходились в стороны средневековые посады. Культурные напластования Оршанского городища мощностью до 3-х метров и более сохраняют материалы XI–XVIII вв., относящиеся к различным сферам жизни средневекового населения.

На противоположном берегу р. Оршица вы можете видеть **храм Рождества Богородицы**. Он был отмечен на планах Орши начала 1770-х гг. и 1813 г. Здание представляло собой произведение архитектуры переходного стиля от барокко к классицизму. В 1960-е гг. было разрушено.

В 1987 г. были вскрыты многочисленные фрагменты фундаментов церкви, ее подвалы, найдены полихромные изразцы, плитки пола, раскопаны древние захоронения. На фундаменте старого храма был возведен храм-новодел. Рядом с храмом Рождества Пресвятой Богородицы находится построенный в 1990 г. деревянный храм Михаила Архангела. В народе это здание называют **Михайловской церковью**. Построен в 1995 году в стиле церковной архитектуры русского севера.

За деревьями, немного правее Михайловской церкви, мы видим **костел доминиканцев святого Иосифа**, построенный в XVII в. монахами-доминиканцами. Орден доминиканцев существует с XIII века. Есть несколько версий его основания. Которым из них больше доверять, решайте сами. По одним сведениям, костел был построен в 17 веке, и в 1649 году князь Сокольницкий дал в нем приют доминиканцам, прибывшим на литовскую землю. Тогда костел носил имя святого Иннокентия. По другим источникам, костел был построен лишь в 1819 году. В 1864 году костел был поврежден. Его восстановили, но в процессе реконструкции снесли две башни, находящиеся над главным фасадом костела. В советское время в костеле находился Дом культуры строителей. А в 1990 году его вновь передали католической пастве, которая начала его реконструкцию. С этих пор костел стал носить имя святого Язепа.

В настоящее время костел представляет собой памятник архитектуры стиля ба-

Репозиторий ВГУ

рокко с элементами классицизма, но сохранился в перестроенном виде.

Мы находимся у этнографического музея **«Млын»**. Этот архитектурный памятник был сооружен в 1902 году и ранее выполнял функции мельницы, отсюда и происходит современное название музея.

Изначально здание мельницы было выполнено из дерева. До 1910 года мельница работала на пару, а в 1910 году у мельницы появляется новый хозяин – зажиточный помещик, по приказу которого в мельнице был установлен электрический генератор. После Октябрьской революции, расположенная в здании мельница прекращает работать, и здание выполняло в разные годы различные функции. В 1991 году в здании бывшей мельницы было решено разместить этнографический, по своему типу, и научно-просветительский, по профилю, музей. В 1995 году музей «Млын» принял своих первых посетителей.

Трехэтажное здание музея расположено в низине, рядом с речкой. В нижней части здания можно увидеть колесо водяной мельницы. Установлено оно недавно, исторической ценности не представляет. Рядом со зданием располагается сад камней .

В музейных фондах хранится этнографический материал: одежда и предметы быта белорусского крестьянства конца XIX – нач XX века, образцы ремесленного и прикладного творчества, а также ручные работы современных белорусских мастеров.

В музее «действует одна постоянная экспозиция, которая располагается на двух этажах здания и состоит из двух частей. В первой части экспозиции, носящей название «Хлеб наш насущный» представлены экспонаты, которые раньше использовались крестьянами при посевных работах и в процессе жатвы зерновых.

Вторая часть экспозиции – «Свет души и таланта» размещается на втором этаже. Здесь посетителей ожидает знакомство с предметами ремесленного творчества нач. XX века, а также с предметами, которые представляют духовную культуру Оршанщины.

**Иезуитский коллегиум** – ныне реконструирован, а также достроена башня (высота 35 метров) с часами. Резиденция иезуитов появилась в Орше в 1604 (1612?) г. Возведение каменных зданий началось в 1690 г. Костел был достроен только к 1760 г., в 1840-х – разрушен. Коллегиум, созданный при костеле действовал в 1690–1803 годах. Его здание восстановлено в 2007–2008 годах. С 1839 по 1990 здесь была городская тюрьма.

Пройдя по главной площади города, мы можем прямо с неё видеть остатки жилого корпуса **монастыря базылиан**. В 1774 году в Орше был возведен каменный базылианский мужской монастырь. В нем находились костел Опеки Матери Божьей и двухэтажное здание с монашескими кельями. Костел уничтожили в 1969 году. До наших дней сохранился жилой корпус, находящийся в ведении Витебской епархии и требующий капитального ремонта или консервации.

Мы с вами можем прогуляться по городскому парку и увидеть **аллею городов-побратимов**. А через дорогу располагается **Музей истории и культуры города Орши**.

Постановление Верховного Совета БССР “О создании **Музея истории и культуры города Орши**” вышло ещё в 1984 году. Но процесс создания музея растянулся на долгое время – никто не мог ответить на главный вопрос: где разместится его экспозиция? И только в 1987 году эта проблема была решена. Так, решением горсовета для краеведческого музея было выделено здание бывшего штаба гражданской обороны. Символично, что это здание является частицей истории нашего города – памятником гражданского строительства конца XIX – начала XX вв. В первой половине XX века в здании находился жилой дом и небольшой магазин галантереи. В 1949 году было пристроено ещё одно здание, в котором размещался радиоузел города. В 1987 году создана инициативная группа. Возглавил её на тот момент оршанский краевед, преподаватель истории Игорь Ершов.

Музей истории и культуры города Орши – филиал Учреждения культуры «Му-

Репозиторий ВГУ

зейный комплекс истории и культуры Оршанщины» был основан 1 марта 1989 году, а открыт для посетителей в декабре 1992 года. Экспозиция музея представляла собой последовательный обзор исторического прошлого с акцентом на ключевые события региона, начиная от первобытнообщинного строя, заканчивая второй половиной 80-х годов XX века.

А сейчас мы находимся возле бывшего жилого корпуса **монастыря тринитариев**. Сейчас в этом здании расположился ЗАГС и Архив. Пройдём к половине здания принадлежащей ЗАГСу. Здесь все желающие могут сфотографироваться на своеобразном "троне невест". Поговорим подробнее о том, кто же такие тринитарии и чем они занимались. Тринитарии – католический нищенствующий монашеский орден, основан в 1198 году для выкупа пленных христиан из мусульманского плена. Строгий устав запрещал тринитариям вкушать в обычное время мясо и рыбу и владеть какой-либо собственностью. Выполняя свою основную задачу, за 437 лет (с 1258 до 1696 года) орден выкупил из мусульманского плена 30 732 невольника. Средства для выкупа тринитарии, главным образом, добывали сбором милостыни. Нередки были случаи, когда тринитарии отдавали себя самих в рабство за освобождение пленников. К примеру, в 1580 году они выкупили из алжирского плена Мигеля де Сервантеса, после чего он вернулся в Испанию и написал «Дон Кихота». Орден во многих странах действует до сих пор.

К сожалению, сведений о монастыре тринитариев сохранилось очень мало. Согласно плану города Орши начала 1770-х годов в Надднепровском посаде города, на северо-восточной стороне главной площади, размещался монастырь тринитариев. Фундуш на строительство монастыря получен 2 мая 1714 года.

Строительство началось в этом же, 1714 году, и продолжалось 3 года. Уже в 1717 году храм освятили. Костел был освящен в честь Святой Троицы. Фундаторами данного монастыря были братья Адам и Казимир Саковичи.

Монастырь был обнесен каменной оградой. На территории монастыря находились флигель, возовня, сарай для сена, конюшня, хлев.

Планировка здания, функциональное использование отдельных помещений описаны в Визитном описании монастыря тринитариев в м. Орша, составленном в 1824 году. Здание монастырского корпуса было каменным, двухэтажным и имело две линии. Одна линия имела длину 66 аршин, другая – 54 аршина. Ширина каждой линии – 4 аршина. Слева от входа находились двери, ведущие в подвал для хранения овощей. В монастыре имелись пекарня, кладовая, гардеробная, библиотека, зал.

В краеведческой литературе имеются сведения о том, что в 1836 году здание костела тринитариев было перестроено под православный Воскресенский собор, закрытый в первые годы Советской власти. В тех же 20-х годах 20-го столетия собор переоборудовали под аэроклуб, разрушив четыре угловых башни собора.

В период Великой Отечественной войны собор был поврежден, но еще использовался в послевоенные годы. 6 октября 1960 года Оршанский горисполком принял решение «О разрушении и уборке развалин от бывших церковных зданий в г. Орша», согласно которому Оршанский горкомхоз взорвал здание собора и очистил площадку от церковного здания по ул. Комсомольской.

Жилой корпус монастыря тринитариев отнесен к памятникам архитектуры решением Витебского облисполкома только в декабре 1990 года.

Внутри здания небольшая обзорная экскурсия которую проведёт непосредственно работник архива.

После проведения экскурсии необходимо провести рефлексию.

Репозиторий ВГУ

# ПАТРАБАВАННІ ДЛЯ АБГРУНТАВАННЯ СТАТУСУ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ ВЫЯЎЛЕНАМУ МАТЭРЫЯЛЬНАМУ АБ'ЕКТУ

Абгрунтаванне мусіць мець сціслыя фактычныя звесткі аб гісторыка-культурнай каштоўнасці:

- *назва,*
- *від каштоўнасці,*
- яе *месцазнаходжанне,*
- *дата стварэння,*
- *стваральнік,*
- звесткі аб уласніку (уладальніку),
- *парадак выкарыстання,*
- *сучасны тэхнічны стан,*
- апісанне яе гісторыі,
- ацэнка яе гістарычнага, навуковага, мастацкага, культурнага або іншага значэння,
- элементы, якія маюць свае адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці,
- дадатковыя звесткі аб падзеях і асобах, звязаных з гэтай гісторыка-культурнай каштоўнасцю,
- выкарыстаныя архіўныя і бібліяграфічныя крыніцы, графічны матэрыял).

Да падрыхтаванага абгрунтавання прыкладаюцца фотаздымкі гісторыка-культурнай каштоўнасці, зробленыя з розных кропак, выкапіроўка з Генплана. Пры яе адсутнасці схему знаходжання каштоўнасці з прывязкай да мясцовасці можна самому зрабіць. Падрыхтаваныя дакументы дасылаюцца ў Міністэрства культуры, Упраўленне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. 220030, г. Мінск, вул. Леніна, 22.

Спіс дакументаў павінны складацца з

1) заявы;
2) абгрунтавання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці выяўленага матэрыяльнага аб'екта;
3) фотаздымкаў;
4) выкапіроўкі з плана.

Помнікі бяруцца на часовы ўлік Міністэрствам культуры, а збор матэрыялаў і падрыхтоўка абгрунтавання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ўскладаецца на аддзел культуры гар/райвыканкама. На дадзеным этапе варта дапамагчы спецыялісту гэтага аддзела ў зборы матэрыялаў і падрыхтоўкі прэзентацыі для Навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь (220030, г. Мінск, вул. Леніна, 22.).

Репозиторий ВГУ

# ПРЫКЛАДЫ АПІСАННЯ І АБГРУНТАВАННЯ СТАТУСУ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ ВЫЯЎЛЕНЫМ МАТЭРЫЯЛЬНЫМ АБ’ЕКТАМ

## Сядзібны дом маёнтка “Мілае” ў в. Мазалава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна

*Архітэктура*

Сядзібны дом маёнтка “Мілае” знаходзіцца ў в. Мазалава Віцебскага раёна. Сядзіба пабудавана ў 1801 г., а аздоба памяшканняў працягвалася да 1806 г.[1] Дом пабудаваны ў класічным стылі. Будынак двухпавярховы, мае прамавугольную форму і сіметрычную кампазіцыю з ярка вызначанай цэнтральнай часткай – рызалітам і франтонам трохкутнага тыпу. Архітэктура будынка простая, з адсутнасцю якіх-небудзь яркіх упрыгожванняў. Па вертыкалі будынак разбіты трыма гарызантальнымі паясамі. Карніз аздоблены аркатурай. Вокны цэнтральнай часткі будынка ўпрыгожаны фігурнымі паясамі (сандрыкамі). На астатніх упрыгожванні адсутнічаюць. Дах быў ці чатырохскатны высокі, ці чатырохскатны ламаны. У цяперашні час зменены.

Фасад быў упрыгожаны каванымі балконамі, а франтон – люстрам, які, верагодна, мог выкарыстоўвацца для ўтрымання гадзінніка ці як ляток для галубятні. Захаваўся бакавы ўваход, які быў упрыгожаны каваным навесам.

*Сучасны стан*

На сённяшні дзень ад усяго маёнтка захаваўся сядзібны дом, таксама некаторыя гаспадарчыя пабудовы (размешчаны на тэрыторыі механічнага двара ПМК № 29). Знаходзіцца ў цэнтры вёскі, каля будынка ПМК № 29. У паслярэвалюцыйны і пасляваенны час у будынку размяшчалася сярэдняя школа. Пасля будаўніцтва ў вёсцы новай школы, у сядзібным доме зрабілі інтэрнат. Рашэннем Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта № 348 ад 27.12.1990 г. сядзібны дом быў узяты пад ахову дзяржавы і ўнесены ў спіс помнікаў Віцебскай вобласці. Меркавалася размясціць у будынку школу мастацтваў. Аднак сацыяльная і эканамічная нестабільнасць пачатку 1990-х гг. не дазволіла давесці запланаванае да канца. Дом не выкарыстоўваецца. Тэхнічны стан здавальняючы. Знаходзіцца ў маёмасці Мазалаўскага сельскага савета, аднак плануецца перадача ва ўласнасць Рускай праваслаўнай царкве.

На тэрыторыі сучаснага Віцебскага раёна існавала больш за 150 сядзіб. Сярод іх былі вельмі буйныя, якія належалі славутым людзям: роду Агінскіх, У. Адамаву, А.С. Бялыніцкаму-Бірулю, А. Вярыгу-Дарэўскаму, К. Гібенталю, С. Косаву, Краснадземскім, В. Лужынскаму, Г. Марцінкевічу, Сапегам, А.П. Сапунову і іншым. Захавалася толькі “Мілае” ў в. Мазалава. Адзначым, што гэта адзіны сядзібны дом у наваколлях Віцебска. Знаходжанне яго ў непасрэднай блізкасці ад буйнога горада робіць вельмі каштоўным аб’ектам у мясцовым турызме, як помнік архітэктуры канца XVIII – пачатку XIX ст.

*Страчаныя часткі сядзібы*

*Вадзяны млын*. На р. Лужаснянка, у 400 м. ад сядзібнага дома, быў пабудаваны двухпавярховы млын, які з’яўляўся самым вялікім у Віцебскім павеце. У 1864 годзе, напрыклад, ён меў 10 ставоў і намолваў 36 000 пудоў мукі (амаль 580 тон). Другі па велічыні знаходзіўся ў маёнтку Лужасна, меў 8 ставоў і намолваў 27 000 пудоў мукі

[1] Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. Ф. 1947. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 96. Анкета на маёнтак Мазалава.



Репозиторий ВГУ

(больш за 430 тон)[2]. Другі, драўляны, паверх млына разабраны па загадзе Віцебскага райкама КПБ у 1983 г. У канцы 1990-х гг. першы паверх разабралі на цэглу мясцовыя жыхары. Захаваліся рэшткі механізмаў, плаціны, навяснога маста.

*Гаспадарчыя пабудовы*. У маёнтку меліся свіран у некалькі паверхаў, хлявы з высокімі падмуркамі і светлавымі вокнамі, ляднік. Існаваў водаправод. Насупраць дома быў фантан. Каля маёнтку, які апісваў у сваёй працы А. Рыпінскі, быў парк з мноствам дэкаратыўных дрэваў[3].

*Могілкі*. На левым беразе р. Лужаснянкі насупраць млыну (100 метраў уверх па цячэнні ад рэшткаў мастка праз рэчку) былі фамільныя могілкі. Тут і быў пахаваны заснавальнік маёнтка. Знішчаны ў канцы 1970-х – пайшлі на падсыпку дарогі[4].

*Калекцыя*. Гаспадарамі маёнтку была сабрана багатая бібліятэка і вялікая калекцыя карцін, мастацкіх вырабаў са шкла, металу, фарфору, мармуру, дрэва, керамікі. Гаспадар займаўся вопытамі з электрычнасцю. У 1830 г. Вольным эканамічным таварыствам у Пецярбургу І. Манькоўскі быў узнагароджаны залатым медалём за пісьмовую работу па паляпшэнні сялянскай гаспадаркі на Беларусі[5].

Пасля рэвалюцыі калекцыя была часткова разрабавана, часткова вывезена ў г. Віцебск. У пратаколе пасяджэння Віцебскай губернскай камісіі па ахове помнікаў даўніны і прадметаў мастацтва ад 10 лютага 1920 г. адзначаецца, што "з маёнтка "Мазалава" адбываецца вываз прадметаў даўніны"[6].

*Гістарычная даведка*

Сядзібны дом маёнтка "Мілае" ў в. Мазалава Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна належаў беларускаму асветніку і грамадскаму дзеячу, верагоднаму аўтару першай паэмы на беларускай мове "Энэіда навыварат", статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Манькоўскі Ігнацій (каля 1765 – 30.12.1831 (11.01.1832)), публіцыст, асветнік, удзельнік літаратурнага жыцця на Віцебшчыне ў 1-й трэці XIX ст. Нарадзіўся на Віцебшчыне[7].

Паходзіў з беларускай шляхты. Ранні перыяд біяграфіі не высветлены. Ёсць звесткі, што юнацкія гады правёў у беднасці, вучыўся ў адным з езуіцкіх калегіумаў. Меў значныя здольнасці, пастаянна папаўняў свае веды і стаў па-еўрапейску адукаваным чалавекам. У 1783 г. паступіў на службу ў адну з канцылярый Усходняй Беларусі, праз 4 гады – у штат беларускага генерал-губернатара перакладчыкам "па замежнай экспедыцыі". Калі яму было за 30 гадоў, закахаўся ў юную дачку мясцовага вяльможы – Рахіль Антонаўну Макавецкую. Бацькі былі супраць яе шлюбу з бедным чыноўнікам. І. Манькоўскі паехаў у Пецярбург з пісьмом сваёй абранніцы да цара, здолеў выклікаць прыхільнасць імператара Паўла І, які ўзяўся быць яго сватам і апекуном. 17 лютага 1797 г. быў выдадзены ліст-рэскрыпт Паўла І адносна І. Манькоўскага. Ва ўказе казалася аб наданні яму чына надворнага саветніка і перадачы ў пажыццёвае валоданне казённага маёнтка Буёва ў Віцебскім павеце. Па імператарскім загадзе ад 11 сакавіка 1797 года Ігнату Манькоўскаму надаваўся чын надворнага саветніка Беларускай губерні. У яго пажыццёвае валоданне перадаваўся казённы маёнтак Буева з вёскамі Плятнішчы, Выгары, Хмары, Сакольнікі, Малахава.

[2] Памятная книжка Витебской губернии за 1865 год. – С. 302.
[3] Кісялёў Г. Манькоўскі // Загадка беларускай "Энеіды". – Мн., 1971. – С. 405.
[4] Киселев Г. "Разыскивается классик…". – Мн.: Мастацкая літаратура", 1989. – С. 97–99, 398.
[5] Газін Дз.Р. Мазалаўская "Швейцарыя". – Віцебск, 1993. – 8 с.
[6] ДАВВ. Ф. 1947. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 3–4. Пратакол паседжання камісіі па ахове помнікаў даўніны і прадметаў мастацтва ад 10 лютага 1920 г.
[7] Асветнікі зямлі Беларускай: энцыкл. давед. / рэдкал.: У.М. Жук. – Мн.: БелЭн, 2001. – С. 277.



Репозиторий ВГУ

Аднак пажыццёвае валоданне азначала, што ягоныя дзеці страцяць казённы маёнтак і ён зноў адыдзе казне. Таму пазней на свае грошы Манькоўскі набыў в. Мазалава ўжо ў прыватную ўласнасць.

Праз некаторы час набыў у шляхціца Талька (Талькэ, Талько?) вёску Мазалава. Пабудаваў тут маёнтак, які назваў Антонава (Антонаўка, Antonowka) у гонар народжанага сына. Разумным гаспадараннемператварыў яго ва ўзорны, які потым стаў называцца "Мілае". З 1801 г. атрымаў пасаду віцебскага губернскага пракурора.

У 1812 г. пры падыходзе французаў да Віцебска Манькоўскі эвакуіраваўся з губернскімі ўстановамі ў глыб Расіі (Вялікія Лукі, Луга). Вярнуўшыся ў вызвалены Віцебск, І. Манькоўскі з-за адсутнасці губернатара і віцэ-губернатара ўзначаліў губернскую адміністрацыю, прыняў захады, каб хутчэй наладзіць жыццё ў спустошаным краі. 8 красавіка 1813 г. ён афіцыйна атрымаў пасаду віцебскага віцэ-губернатара.

Пасля выхаду ў адстаўку ў 1817 г. жыў у сваім маёнтку Мілае, займаўся гаспадаркай, літаратурай і навукамі. Поглядамі быў блізкі да дзеячаў Асветніцтва. У маёнтку меў калекцыі старажытных рэчаў, праводзіў доследы з электрычнасцю.

У 1830 г. прыняў удзел у конкурсе, абвешчаным Вольным эканамічным таварыствам у Пецярбурзе, які меў мэту садзейнічаць развіццю гаспадаркі Беларусі. Твор І. Манькоўскага быў адзначаны залатым медалём і надрукаваны ў часопісе таварыства.

Усе матэрыялы заснаваны на мясцовай інфармацыі і з'яўляюцца цікавай крыніцай па даследаванні стану сельскай гаспадаркі, сялянскіх пабудоў. Акрамя гэтага апісвае вясельны абрад у Віцебскім павеце ў першай трэці XIX ст. Твор змяшчае цікавыя звесткі пра прымхі і забабоны мясцовых жыхароў, якія яны ўжывалі супраць эпізаотый.

І. Манькоўскі захапляўся жывым беларускім словам, папулярызаваў паэму "Энеіда навыварат", верагодна, сам пісаў па-беларуску, у сувязі з чым многія землякі і сучаснікі (Р. Друцкі-Падбярэскі) лічылі яго аўтарам беларускай "Энеіды".

*Паданне пра Ігната Манькоўскага і маёнтак Мілае ў в. Мазалава.*

Малады небагаты дваранін Ігнат Манькоўскі закахаўся ў дачку важнага вяльможы. Каханне было ўзаемным. Але калі ён пасватаўся да дзяўчыны, то бацька адмовіў яму па некалькіх прычынах: Манькоўскі быў небагаты і не меў маёнтку і сродкаў на ўтрыманне сям'і, не меў высокага звання. Бацька прапанаваў пасватацца яшчэ раз, калі жаніх будзе багатым і пры пасадзе. Манькоўскі разумеў, што вяльможа не стане чакаць дзесяцігоддзі, калі ён зможа стаць такім, а выдасць дачку за іншага. І. Манькоўскі напісаў ліст імператару Паўлу І, у якім распавёў пра выпадак. І змог сустрэцца з ім. Павел І пашкадаваў закаханых і загадаў перадаць І. Манькоўскаму ў пажыццёвую ўласнасць фальварак (гаспадарку з некалькімі вёскамі) і надаць Манькоўскаму не наступны чын, а той, які ішоў праз адзін. Больш таго, ён згадзіўся быць сведкам з боку жаніха на вяселлі. Пасля такога бацька не мог адмовіць Манькоўскаму і маладыя пажаніліся. Потым Манькоўскі набыў в. Мазалава і пабудаваў маёнтак, які назваў "Мілае". Частка падання прыведзена ў № 8 часопіса "Русская старина" за 1882 г.[8].

---

[8] Маньковский К.А. Император Павел I и Игнатий Маньковский // Русская старина. – 1882. – № 8.



Репозиторий ВГУ

## Адміністрацыйны будынак былой Землеробчай школы ў в. Лужасна Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна

Знаходзіцца ў паўднёвай частцы вёскі. Пабудаваны ў другой палове XIX ст. – пач. XX ст. з цэглы. З'яўляецца элементам комплексу Землеробчай царквы, у які ўваходзілі таксама гаспадарчыя пабудовы, драўляныя інтэрнаты.

Аднапавярховы мураваны, крыжападобны (двайны крыж) у плане будынак. Знешняе аздабленне паўтарае стылістыку галоўнага будынку Землеробчай школы. Фасады выфарбаваны ў 2 колеры. З мэтай упрыгожвання франтонных выступаючых частак будынка выкарыстаны элементы фахверка. Завершыя франтонаў маюць вільчыкі.

Будынак – помнік архітэктуры з элементамі стылю "мадэрн".

Частка памяшканняў будынку не выкарыстоўваецца, у некалькіх пакоях змешчаны вузел электроннай сувязі.

Адміністрацыйны будынак з'яўляецца часткай комплексу былой землеробчай школы ў в. Лужасна, галоўны будынак якой знаходзіцца пад аховай дзяржавы: пастановай Савета міністраў Рэспублікі Беларусь № 578 ад 14.05.2007 г. Мэтазгодна, на нашу думку, уключэнне адміністрацыйнага будынку ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў як састаўной часткі комплексу былой землеробчай школы ў в. Лужасна.

## Царква Узнясення (Пакроўская) у в. Лужасна Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна

Знаходзіцца на вул. Лынькова, на правым беразе ракі Дзвіна. Пабудавана ў канцы XIX ст. з чырвонай цэглы. Прасторавая кампазіцыя складаецца з крыжовага ў плане асноўнага аб'ёму, трохяруснай шатровай званіцы і пяціграннай апсіды. Сцены прарэзаны арачнымі вокнамі з кілепадобнымі ліштвамі, шматлікі архітэктурны дэкор вылучаны тынкоўкай на фоне чырвонай цаглянай муроўкі.

Царква – прыклад архітэктуры псеўдарускага стылю.

Будынак царквы знаходзіўся пад аховай дзяржавы і быў занесены ў Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі (№ 837) [9].

# ПРЫКЛАДЫ АФАРМЛЕННЯ АПІСАННЯ І АБГРУНТАВАННЯ СТАТУСУ ПОМНІКАЎ ПРЫРОДЫ

## Хвоя-гігант каля в. Сушчова Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна

Хвоя звычайная (*Pinis silvestris*) каля в. Сушчова Мазалаўскага с/с. Віцебскага раёна, самая вялікая хвоя на Беларусі. Вырастае на беразе р. Лужаснянкі ў 4 км ад вёскі. Дыяметр дрэва 142 см. Вышыня 28 метраў. Узрост прыкладна 200–250 гадоў. Патрабуе неадкладнай аховы не толькі таму, што яно самае вялікае сярод хвояў краіны, але і таму, што гэта вялікаўзроставае дрэва, яно з'яўляецца высокадэкаратыўным элемент ландшафта. З улікам агульнага фону растроеных дрэвастояў у выніку бессістэмных высечак такое вялікае дрэва з'яўляецца важным эстэтычна-атракцыйным элементам пейзажу. Яно з'яўляецца важным асяродаўтваральным элементам, прысадай для рэдкіх, каштоўных птушак (арол-маркут, скапа), пералётных чарод лясных вераб'іных птушак.

[9] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мн.: БСЭ імя П. Броўкі. – С. 192.



Рэпазіторый ВДУ

Акрамя таго, – гэта каштоўнае дрэва-матачнік мясцовай папуляцыі *Pinus silvestrus* і высокабанітэтны экзэмпляр свайго віду.

## Дуб-волат каля в. Александрова Багушэўскага п/с Сенненскага раёна

Дуб каля в. Александрова знаходзіцца на ўскраіне вёскі, на правым беразе безыменнай ручаіны (на карце 1780 ручай Лучанка), якая выцякае з возера Кічына. Прыкладны радыус дрэва – 1,25 см. Узрост – 300–500 гадоў.

Дуб каля в. Александрова – гэта каштоўнае дрэва-матачнік мясцовай папуляцыі *Qerqus robur* і высокабанітэтны экзэмпляр свайго віду. Дуб-волат, гэта вялікаўзроставае дрэва, якое з’яўляецца важным асяродаўтваральным элементам, высокадэкаратыўным элементам ландшафта і значным эстэтычна-атракцыйным элементам пейзажу.

Вывад. Дуб каля в. Александрова – гэта адзін з самых вялікіх і старых дубоў у нашай краіне. Такія памеры і ўзрост – унікальныя для Беларусі і для Усходняй Еўропы.

## Вялікія камяні Кавалёўскія каля в. Кавалёва Віцебскага раёна

Знаходзяцца ў 400 м. на паўднёвы ўсход ад вёскі Кавалёва Варонаўскага с/с Віцебскага раёна, у рэчышчы ручая Бязыменнага. Першы камень памерамі **320 х 220 х 180** см. ляжыць упоперак рэчышча, перагаражваючы цячэнне вады. Камень добра бачны. Асноўная парода – граніт рапаківі.

Другая камлыга знаходзіцца у 150 м. на ўсход ад першага каменя, далей ўверх па ручаю. Яго памеры: **550 х 150 х 180** см. Аднак, не гледзячы на тое, што камень № 2 значна большы за першы, выглядае ён не так эфектна. Ён ляжыць пад самым берагам у глыбокім месцы і напалову схаваны ў вадзе. Зверху на яго насунулася шмат зямлі, якая парасла травой і пустазеллем.

## Камень Кахання каля в. Доўжа Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна

Валун знаходзіцца на адлегласці 400 метраў на паўднёвы ўсход ад ускраіны вёскі Доўжа Мазалаўскага с/с., непадалёк ад падстанцыі і лініі электраперадач, на правым беразе ракі Храпаўлянкі ў 10 метрах ад урэзу вады на адрэзку паміж азёрамі Сярэднім і Малым. Гэтае месца мясцовыя жыхары людзі называюць Баравінкай. Даўжыня – 250 см; шырыня – 160 см, вышыня – 320 см. Камень патрабуе аховы і па сваіх памерах і па той прычыне, што пра яго існуюць паданні.

*Паданне*. Даўным-даўно жыла ў вёсцы дзяўчына. Праездам у вёсцы быў пан. Ён пасватаўся да бацькоў дзяўчыны, і яны аддалі дачку за яго. Але дзяўчына закахалася ў мясцовага каваля па прозвішчы Сасноўскі і стала патаемна сустракацца з ім. Рабілі яны гэта каля вялізнага каменя, што ляжаў на беразе рэчкі Храпаўлянка, якая цякла з возера ў Дзвіну. Пра сустрэчы каля каменя стала вядома пану, і ён загадаў высачыць закаханых і забіць іх. Служкі пана так і зрабілі. Целы забітых пан загадаў кінуць у возера. Душы іх не будуць мець спакою да канца вякоў (калі нябожчыкі не пахаваны па хрысціянскім абрадзе, душы не змогуць трапіць ні ў рай, ні ў пекла, а вымушаны будуць цярпець і чакаць канца свету). Загадаў зрабіць ён так і таму, каб знішчыць усялякую памяць пра здраду і людзей, якія адважыліся на яе. Але людзі памяталі пра зладзейства і сталі называць возера па прозвішчы каваля – Сосна. Асабліва шкада было людзям дзіця, якім, як потым высветлілася, была цяжарная дзяўчына.

Пэўны сэнс у паданні ёсць. На Беларусі ніколі не было азёраў з назвамі Сосна. Тапанімічны слоўнік Беларусі[10] кажа, што такія назвы маглі з'яўляцца толькі ў выніку перайменавання ў сувязі з якімі-небудзь надзвычайнымі падзеямі. Такой падзеяй мог быць рэальны выпадак з закаханымі. Назва каменя, яго месцазнаходжанне (на беразе ракі і возера), звесткі пра тое, што на ім былі забіты людзі, ускосна сведчаць пра тое, што ён мог выкарыстоўвацца ў якасці месца для ахвярапрынашэнняў і знаходзіўся на капішчы.

## Святая крыніца каля в. Суднікі Мазалаўскага с/с Віцебскага раёна

Знаходзіцца непадалёк ад в. **Суднікі** ў лесе. Уяўляе сабою 2 "акна" няправільнай формы памерам прыблізна 3 на 4 метры. Краі "вокнаў" аплецены каранямі дрэў. У асноўным гэта яліны. Глеба чорнага колеру, рыхлая і мяккая. Вада чыстая, без паху. Вокны знаходзяцца адно ад другога прыкладна метрах у дваццаці. У адным пастаўлена металічнае кальцо дыяметрам метр. У саміх "вокнах" і каля іх ляжаць бярвенні для таго, каб з іх лягчэй было падыходзіць і набіраць ваду. Вада з "вокнаў" цячэ спорна і ўтварае добрую ручаіну. Яна бяжыць у бок Дзвіны. Праз некалькі соцень метраў зроблены жалезны масток. Бачна, што ён тут быў і раней, бо захаваліся рэшткі драўляных лаг і слупоў.

Па сведчаннях мясцовых жыхароў, да рэвалюцыі каля крыніцы стаяў вялікі крыж, свяцілі ваду. Яны ж расказваюць, што яшчэ нават пасля вайны тут стаяла каплічка і крыжы. Цяпер месца патрабуе ўпарадкавання. Вада не стала горшай і браць яе прыязджаюць з гарадоў і вёсак ажно з шматлітровымі флягамі на машынах.

[10] Жучкевич В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии. – Мн., 1974. – 448 с.



Репозиторий ВГУ

# ПЛАН АПІСАННЯ МУЗЕЙНАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ

1. Назва музея.
2. Тып, профіль музея.
3. Поўны адрас, тэлефон.
4. Кіраўнік музея.
5. Дата заснавання музея.
6. Найбольш цікавыя калекцыі.
7. Музейная экспазіцыя:
   - назва экспазіцыі,
   - від экспазіцыі,
   - асноўныя раздзелы экспазіцыі.
8. Найбольш цікавыя экспанаты (не менш 5).
9. Асабістая ацэнка працы музея і ўзроўню экскурсіі.

# МУЗЕІ ВІЦЕБСКА, РЭКАМЕНДАВАНЫЯ ДЛЯ НАВЕДВАННЯ ПАДЧАС ПРАХОДЖАННЯ ПРАКТЫКІ

1. **Віцебскі абласны краязнаўчы музей** (ВАКМ). г. Віцебск, вул. Леніна, 36. Тэл.: 36-47-12; 36-05-87.
2. **Віцебскі мастацкі музей.** г. Віцебск, вул. Леніна, 32. Тэл.: 36-31-45.
3. **Музей-сядзіба І.Я. Рэпіна “Здраўнёва”.** Віцебскі р-н, *пас. Руба. Праезд на гарадскім аўтобусе № 26-а.* Тэл.: 29-16-73.
4. **Экспазіцыя памяці патрыётаў Віцебшчыны** (філіял ВАКМ), вул. Леніна, 32 (вул. Крылова, 7), Тэл.: 36-22-31, 36-31-45, 36-05-87.
5. **Дом-музей Марка Шагала.** г. Віцебск, вул. Пакроўская, 11. Тэл.: 36-34-68.
6. **Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова.** г. Віцебск, вул. Чэхава, 4. Тэл.: 36-69-54.
7. **Віцебскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў.** г. Віцебск, вул. Воінаў-інтэрнацыяналістаў, 20. Тэл.: 61-40-75.
8. **Выставачная зала Цэнтра народных рамёстваў і мастацтваў “Задзвінне”.** г. Віцебск, вул. Чайкоўскага, 3. Тэл.: 36-05-81.
9. **Выставачная зала Цэнтра культуры “Віцебск” “Духаўскі круглік”** г. Віцебск, пр-т Фрунзе, 11а. Тэл.: 35-81-38.
10. **Выставачная зала Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва,** вул. генерала Белабародава, 5, Тэл.: 21-48-94.

### Музеі прадпрыемстваў і ўстаноў г. Віцебска

11. **Музей гісторыі віцебскага трамвая.** г. Віцебск, вул. 5-я Фрунзе, 7. Тэл.: 24-17-39.
12. **Музей Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі.** г. Віцебск, вул. Някрасава, 2а/46. Тэл.: 37-84-15.
13. **Музей анатоміі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.** г. Віцебск, вул. Фрунзе, 27. Тэл.: 24-94-38.
14. **Музей анатоміі жывёл Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.** г. Віцебск, вул. 1-я Даватара, 7/11. Тэл.: 36-09-55.
15. **Музей гісторыі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.** г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 72.
16. **Музей міліцыі (Музейна-выставачная экспазіцыя Галоўнага ўпраўлення НБРБ па Віцебскай вобласці).** г. Віцебск, вул. Леніна, 17. Тэл.: 29-74-41.

Репозиторий ВГУ

17. **Экспазіцыя, прысвечаная гісторыі дарожнай аўтаінспекцыі (ДАІ),** Маскоўскі пр-т, 57, Тэл.: 48-78-16.
18. **Пажарна-тэхнічная выстава Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС.** г. Віцебск, вул. Жасткова, 13. Тэл.: 47-93-24.
19. **Музей гісторыі віцебскай энергасістэмы** г. Віцебск, вул. Газеты "Праўда", 30.
20. **Музей гісторыі віцебскага водаправода** пры ВА "Водаканал" вул. Міра, 37, Тэл.: 24-05-03 (прыёмная); 24-25-11.
21. **Музей спажыўкааперацыі** пры Віцебскім аблспажыўсаюзе. вул. Беларуская, 3, Тэл.: 36-66-82.
22. **Музей кіно** (музейная экспазіцыя УП "Кінавідэапракат" Віцебскага аблвыканкама), вул. Леніна, 40. Дом кіно Тэл.: 37-48-11 (вахта); 37-37-82.
23. **Музей гісторыі газіфікацыі Віцебскай вобласці** УП "Віцебскаблгаз", вул Праўды, 36, Тэл.: 47-45-62 (вытворча-тэхнічны аддзел).
24. **Зала спартыўнай славы Віцебскай вобласці,** пр. ген. Люднікава, 12, Тэл.: 24-96-20, 24-85-54.
25. **Народны музей працоўнай славы** адкрытага акцыянернага таварыства (фабрыкі) **"КІМ"** вул. М. Горкага, 42. Тэл.: 34-13-44 (прафкам).

**Музеі навучальных установ г. Віцебска**

26. **Літаратурны музей** кафедры беларускай літаратуры факультэта беларускай філалогіі і культуры, Маскоўскі праспект, 33. 5-ы паверх, Тэл.: 21-96-73 (дэканат факультэта беларускай філалогіі і культуры).
27. **Біялагічны музей** кафедры заалогіі біялагічнага факультэта, Маскоўскі праспект, 33. 4-ы паверх, Тэл.: 21-58-45 (дэканат біялагічнага факультэта).
28. **Музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва** кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мастацка-графічнага факультэта, Маскоўскі праспект, 33а, корпус маст.-граф. факультэта, Тэл. 21-58-70.
29. **Музей баявой славы 39-й Арміі** ў гімназіі № 5 (былая СШ № 32), вул. Чкалава, 19а, Тэл.: 22-20-52, 22-17-74.
30. **Музей Сям'і** ў гімназіі № 7 (былая СШ № 39), праспект Перамогі, 29а, Тэл.: 21-61-33, 21-00-32, 21-00-52.
31. **Музей баявой славы 43-й Арміі** гімназіі № 9 (былая СШ № 36), Маскоўскі пр-т, 41а, Тэл: 22-52-22 (вахта); 22-04-97.
32. **Музей партызанскай славы** ў СШ № 9, г.п. Руба-2 (Вярхоўе), вул. Школьная, 4, Тэл.: 29-03-59; 21-13-12.
33. **Музей Ганаровых грамадзян г. Віцебска** ў СШ № 12, вул. П. Броўкі, 7, Тэл.: 22-32-41; 22-09-94.
34. **Музейны пакой Героя Савецкага Саюза М.І. Кузняцова** ў СШ № 23, вул. Горкага, 61-а, Тэл.: 34-37-13, 34-06-72.
35. **Комплекс музеяў і экспазіцый мастацка-эстэтычнай накіраванасці** ў СШ № 25 (музей ДПМ, паперапластыкі, І. Салерцінскага, Малая мастацкая галерэя), вул. Чкалава, 22, Тэл.: 22-78-71, 22-16-06.
36. **Музей Героя Савецкага Саюза Ю.В. Смірнова** ў СШ № 35, вул. 11-я Сацыялістычная, 1, Тэл.: 34-00-22, 34-00-03.
37. **Музей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова** ў СШ № 43, вул. Шмырова, 30, Тэл.: 27-02-23; 22-79-82.
38. **Музей пошукавых атрадаў** пры УА "Дзяржаўнае абласное аб'яднанне па арганізацыі пазашкольнай працы з дзецьмі і падлеткамі". Тэл.: 24-30-26, 27-63-11.

Репозиторий ВГУ

39. **Музей баявой славы 953-га штурмавога авіяцыйнага Віцебскага палка** ў прафесійна-тэхнічным ліцэі № 1 (былое ПТВ № 96), вул. Лазо, 103а., кабінет № 42, Тэл.: 24-34-12 (вахта), 24-20-36 (прыёмная).
40. **Музей кулінарнага мастацтва (Музей мастацка-тэхнічнай творчасці** пры Віцебскім дзяржаўным політэхнічным прафесіянальным ліцэі № 2 (былое ПТВ № 16), вул. Леніна, 8, Тэл.: 37-03-78 (прыёмная).

***Полацк***

1. **Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.** Сайт: www.polotsk.museum.by.
2. **Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора.** г. Полацк, вул. Замкавая, 1. Тэл.: (214) 42-53-40.
3. **Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер’я.** г. Полацк, вул. Вайкова, 1. Тэл.: (214) 42-30-41.
4. **Дзіцячы музей.** г. Полацк, вул. Ніжне-Пакроўская, 46. Тэл.: (214) 42-45-58.
5. **Прыродна-экалагічны музей.** г. Полацк, вул. Скарыны, 21. Тэл.: (214) 42-42-13.
6. **Полацкі краязнаўчы музей** г. Полацк, вул. Ніжне-Пакроўская, 11. Тэл.: (214) 42-27-15.
7. **Полацкі музей беларускага кнігадрукавання.** г. Полацк, вул. Ніжне-Пакроўская, 22. Тэл.: (214) 42-57-25.

***Орша***

1. **Аршанскі этнаграфічны музей “Млын”.** г. Орша, вул. Замкавая, 2. Тэл.: (216) 21-20-68.
2. **Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К. Заслонава.** г. Орша, вул. Молакава, 9. Тэл.: (216) 20-26-33.
3. **Музей гісторыі і культуры г. Орша.** г. Орша, вул. Леніна, 9. Тэл.: (216) 21-25-51.
4. **Аршанскі музей У.С. Караткевіча.** г. Орша, вул. Леніна, 26. Тэл.: (216) 21-18-49.

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

**ПІВАВАР** Мікалай Васільевіч

# ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧАЯ ПРАКТЫКА

Метадычныя рэкамендацыі

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*

Камп'ютарны дызайн *Т.Я. Сафранкова*

Падпісана ў друк .2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 3,02. Ул.-выд. арк. 3,08. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 ад 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.

Репозиторий ВГУ